гического пространства, которые в конечном итоге определяют тип экологической культуры вуза.

И третий уровень — личностно-индивидуальный. Он отражает отношения субъектов к себе. У преподавателя это отношение к себе — как к педагогу, у студента — как к будущему специалисту. Мотивы, удовлетворенность своей деятельностью и собой как личностью — вот основа, определяющая содержательный аспект данного уровня.

Выделенные уровни позволяют представить процесс формирования экологической культуры учителя с позиций субъектов деятельности. Центральное место в этом случае занимают студент и подготовленность преподавателей. Наивысшим показателем экологической культуры вуза являются "отношение к себе" преподавателя как к специалисту и студента как к будущему педагогу.

Возможность оптимизации процесса формирования экологической культуры гармонии в вузе реализуется благодаря расширению изначально определенного экологического пространства для каждого из субъектов системы. Важным при этом является расширение пространства и студента, и преподавателя. Занимая центральное место в пространстве экологической культуры вуза, преподаватель обеспечивает связь между администрацией и студентами. И если его интересует качество работы не только в рамках определенных ему профессиональных обязанностей, но и работа всего учебного заведения, его позиция является решающим фактором в развитии экологической культуры вуза в целом.

---

[1] *Резник Ю. М.* Культура как предмет изучения // Личность. Культура. Общество. М., 2001. Т. 3. Вып. 1 (7). С. 176—195.

[2] *Катерный И. В.* Современная социальная философия // Личность. Культура. Общество. С.215—228.

[3] Там же.

[4] *Дорошко О. М.* Экологическое воспитание школьников. Гродно, 2000. С. 5—12.

[5] Подробнее о типах экологической культуры личности см.: Дорошко О.М. Экологическая культура: педагогический аспект. Гродно, 2001. 243 с.

***С. В. Казлова*** *(Мінск),*
*аспірантка Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Беларускага дзяржаўнага універсітэта*

# РОЛЯ АРХЕТЫПІЧНАГА ЎЯЎЛЕННЯ Ў ЗМЕСЦЕ СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫІ

Грамадска-эканамічныя пераўтварэнні, што адбываюцца ў нашай дзяржаве, патрабуюць забеспячэння гаспадаркі высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Рашаючая роля тут належыць сістэме нацыянальнай адукацыі, якая павінна "рыхтаваць сённяшніх грамадзян для жыцця і працы ў заўтрашнім свеце, у якім адзіным пастаянным фактарам будзе зменлівасць"[1]. Таму зазначым: адметнасцю, сучаснай адукацыі з'яўляецца неабходнасць падрыхтоўкі такога спецыяліста, які можа працаваць у дыялогавым рэжыме, гэта значыць на ўзроўнях: 1) міжсуб'ектнага ўзаемадзеяння, 2) інтэркультурнай камунікацыі, 3) адпаведнага метадычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструментарыя, 4) вылучэння зместу і пабудовы адаптаваных да магчымасцей навучэнцаў культурных тэкстаў. Выказанае азначае, што адукацыйныя ўстановы павінны займацца не толькі перадачай навучэнцам спецыфічных ведаў, але таксама асэнсоўваць і трансліраваць нацыянальна-культурны вопыт. Выхаванне на ўзорах айчыннай культуры, яе паглыбленае вывучэнне адыгрывае асноўную ролю ў фарміраванні спецыяліста, яго духоўнага, інтэлектуальнага, маральнага вобліку і тым самым сацыялізуе індывіда, далучае яго да грамадскіх каштоўнасцей. Такім чынам, значэнне нацыянальна-культурнага вопыту ў фарміраванні нацыянальнай сістэмы адукацыі становіцца ўсё больш відавочным, а значыць, задачы нацыянальнай адукацыі павінны знаходзіцца ў цеснай сувязі з развіццём нацыянальнай культуры. Адсюль вынікае, што праблема фарміравання спецыяліста новага тыпу выяўляе сябе як настойлівы імператыў рэфармавання сістэмы адукацыі.

У цяперашні час нацыянальна-культурнае выхаванне, на жаль, не з'яўляецца сістэматычным і адбываецца спантанна. Яно прымае форму асобных святаў ці абрадаў, прымеркаваных да якой-небудзь каляндарнай даты. Аднак выхаванне становіцца арганічным і дасягае пастаўленай мэты (гэта значыць выконвае светапоглядныя функцыі, трансліруе вопыт ад пакалення да пакалення, фарміруе нацыянальную свядомасць, выхоўвае пачуццё нацыянальнага гонару і годнасці), калі працэс уключаны ў сістэму адукацыі.

Падчас адукацыйна-выхаваўчага працэсу нельга абмяжоўвацца толькі здабыткамі прафесійнай культуры. Знаёмства з яе дасягненнямі, безумоўна, — важны аспект для фарміравання ўнутранага стану асобы, але прафесійная культура не заўсёды можа быць зразумелай для непадрыхтаванага чалавека. Таму пачынаць лепш са здабыткаў народнай культуры, з яе міфалогіі, абраднасці, паэтычнай творчасці і інш. Такі падыход, лічым, будзе найбольш эфектыўным, таму што ў народнай творчасці захоўваюцца архаічныя пласты культуры, "пабудаваныя" на "ведах", блізкіх абсалютна кожнаму этнафору. Слова "веды" мы бяром у двукоссе, бо маем на увазе не веды як такія, а універсальныя праобразы культуры — архетыпічныя ўяўленні (архетыпічнае), якія ў найбольш адэкватным выглядзе змяшчаюцца ў розных формах культурнай традыцыі. Як уяўляецца, праобраз тут першапачаткова выступае ідэалам, што валодае пэўнымі станоўчымі або адмоўнымі, але ў роўнай ступені здольнымі ўплываць на лёс суб'ектаў, рысамі. Каб "вырас" ідэал, патрэбна ўрадлівая глеба. У даным выпадку такую ролю адыгрывае бязмежная вера. Спалучэнне веры і ідэалу надае праобразу найбольшую ступень рэальнасці ў выяўленні. Менавіта таму праобраз падаецца старажытным людзям такой самай рэальнасцю, як і існаванне іх саміх. У выніку такога падыходу архетыпічнае набывае імператыўны характар і інстытутыалізуецца ў розных формах традыцыі, кожная з якіх утварае з праобразам сінкрэтычнае адзінства ў справе трансляцыі культурнага вопыту.

Перш чым засяродзіцца на змесце сучаснай нацыянальнай культуры, гэта значыць яе архетыпічнага зместу, мэтазгодна закрануць пытанне архетыпічнага ўяўлення. У артыкуле замест традыцыйнага тэрміна "архетып" мы карыстаемся таксама Юнгавым тэрмінам "архетыпічнае ўяўленне" ("архетыпічнае"), бо лічым яго найбольш адпавядаючым фактам рэчаіснасці. Дарэчы, Юнг сам піша аб неабходнасці размяжоўваць "архетып" і "архетыпічнае ўяўленне" ("архетыпічнае")[2], якое, паводле Юн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га, валодае сэнсамі і вылучаецца ў розных культурна-гістарычных формах[3]. "Архетып", у адрозненне ад "архетыпічнага", нічога не азначае, з'яўляецца пустэчай, а значыцца, у культуры ніякім чынам, акрамя ўнутраных магчымасцей, быць прадстаўлены не можа. "Архетыпічнае ўяўленне" (сюжэт, вобраз, матыў, дэталь і інш.) — ператвораны "агент" архетыпа ў культуры, з'ява культурная, таму ў межах культуралагічнага, філасофскага і іншых дыскурсаў аналізаваць пажадана "архетыпічнае ўяўленне". Кіруючыся гэтымі развагаміі, мы выкарыстоўваем тэрмін "архетыпічнае ўяўленне".

Прымаючы агульнапрыняты тэзіс аб канстантнасці архетыпічнага, усё ж такі адзначым іх устойлівасць да знешняга ўплыву, што не адмаўляе іх высокай пластычнасці. Гэта азначае наступнае: архетыпічнае арганічна "ўпісана" ў любыя змены, якія адбываюцца з чалавецтвам на працягу ўсёй культурнай гісторыі. Падчас развіцця яно выступае сувязным звяном паміж соцыякультурнымі з'явамі, а значыцца, новае абавязкова "нясе" ў сабе элементы старога. Наяўнасць такіх элементаў адлюстроўвае развіццё культуры: захоўваюцца найбольш існасныя, "архетыпічныя" элементы мінулага, якія "мігрыруюць" з адной культурнай формы ў другую, а таму новыя этнанацыянальныя тэксты таксама ўтвараюцца з дапамогай архетыпічных слаёў культуры. Універсальны правобраз выступае як семантычны цэнтр і выконвае кансалідуючую ролю паміж чалавекам і чалавекам, чалавекам і супольнасцю, але, у залежнасці ад знешніх умоў, гэта адбываецца кожны раз на іншым, адметным узроўні і ў іншых культурных формах. Каб наблізіцца да правобраза, неабходна правесці працу па яго рэканструкцыі, ачысціць ад культурна-гістарычных напластаванняў і расшыфраваць укладаемыя сэнсы. Такая праца неабходна і ў вышэйшай ступені актуальна на сённяшні дзень, бо, як лічыць Я. І. Міронычык, менавіта праз кадзіроўку архетыпу пачынаецца сапраўднае адраджэнне (адухаўленне) беларускага этнасу[4]. Мы падтрымліваем яго ў гэтай думцы. Як было адзначана вышэй, вылучэнне і вывучэнне этнакультурных правобразаў неабходна і можа рэальна дапамагчы ў вырашэнні не толькі важнейшых пытанняў адукацыйнай рэформы, але таксама іншых праблем сучаснасці, напрыклад: пытанні этнічнага самавызначэння (этнічнай самаідэнтыфікацыі) беларусаў, адраджэння айчыннай культуры і шмат іншых.

Такім чынам, універсальны правобраз — гэта не толькі нешта абстрактна-чалавечае, усім уласцівае, яно не толькі не адмаўляе этнічнае, а наадварот, першачаргова напамінае пра сябе ў разнастайных сферах этнанацыянальнай культуры. Архетыпічнае валодае тымі сэнсамі, якія ўкладае ў яго той ці іншы тып культуры. У сваю чаргу, яно трансліруе гэтыя сэнсы ў культурнай прасторы, адбіваецца на ментальнасці нацыі, уплывае на яго вопыт быцця ў свеце. Так адбываецца таму, што правобразы апасродкаваны рознымі сацыяльнымі формамі і грамадскімі ўяўленнямі, якія ніхто не аспрэчвае і нават не ставіць пад сумненне.

Менавіта таму таксанамія архетыпічнага ўяўлення, вылучэнне двух вялікіх тыпаў — "этнакультурнае" і "універсальнае" — дае магчымасць весці размову аб адметнасці і цэласнасці кожнага тыпу культуры ў межах сусветнай. Этнакультурнае архетыпічнае ўяўляе сабой "канстанты нацыянальнай духоўнасці, якія выяўляюць і замацоўваюць асноўныя ўласцівасці этнасу як культурнай каштоўнасці"[5]. І ў кожным этнанацыянальным тыпе культуры існуюць свае дамінуючыя архетыпічныя ўяўленні. Натуральна, у першую чаргу нас

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цікавіць свая культура, таму адзначым, што даследчыкі вылучаюць такія існасна беларускія праўобразы, як архетып (адвечнага) шляху[6], (адвечнага) скарбу[7], зямлі[8]. Архетыпічнае ўяўленне народа захоўваецца ў выглядзе вобразаў і матываў, эстэтычных арыентыраў, добра знаёмых з маленства (напрыклад, са сказак, міфаў, паданняў...). Веды, атрыманыя пры вывучэнні культурна-гістарычнай спадчыны, дапамогуць падчас далучэння асобы да прафесійнай культуры, бо новая інфармацыя добра сумяшчаецца з ужо знаёмымі праўобразамі. У сваю чаргу, пазнанне, заснаванае на супадзенні ўнутраных вобразаў, гэта значыць архетыпічнага і новага, выклікае адчуванне арганічнай прыналежнасці да культуры і творчасці, усведамлення тоеснасці з уласным народам. Таксама адзначым, што эксплікацыя значэнняў з вядомага на невядомае, устанаўленне падабенства з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных спосабаў засваення новай інфармацыі. Дарэчы, на гэтым грунтуецца ўвесь навучальна-выхаваўчы працэс.

На наш погляд, тыповым архетыпічным уяўленнем беларускай нацыянальнай адукацыі з'яўляецца этнакультурны праўобраз "адвечнага скарбу". Тут маецца на ўвазе не столькі прага да валодання матэрыяльнымі каштоўнасцямі (яно прысутнічае, і мы лічым гэта натуральным чалавечым жаданнем), колькі вялікае імкненне да ведання. Веданне навакольнага асяроддзя, чалавечай прыроды — гэта адвечны скарб, што дае індывіду ўпэўненасць і апору ў жыцці. Пошук адвечнага скарбу ведання, разумнага вырашэння складанасцей — вось тое, што накладае адбітак на паводзіны, інтэлект беларуса і становіцца архетыповым у яго жыцці. Таму, магчыма, нездарма эмблемай Беларускага дзяржаўнага універсітэта з'яўляецца папараць-кветка, якая сімвалізуе нязменнае і адвечнае апірышча, сімвал ведання, што дапаможа асобе прайсці па жыцці і застацца чалавекам.

Напрыканцы адзначым: нацыянальна-культурны змест адукацыі ўяўляе сабой пераемнасную аснову для разумення сучаснай полікультурнай сітуацыі. Таму лічым, што фарміраванне інтэркультурных адукацыйна-выхаваўчых комплексаў у якасці сваёй дыдактычнай і метадалагічнай перадумовы павінна мець распрацоўку праблемы выхаваўчага патэнцыялу этнанацыянальнай культуры і пабудову, адпаведную іх дыдактычным гуманітарным практыкам.

---

[1] ЮНЕСКО. Деятельность в области образования во всем мире. Париж. 1994. С. 8.

[2] *Юнг К.-Г.* Об архетипах коллективного бессознательного // Архетип и символ / Пер. с нем. А. М. Руткевича. М.: RENAISSANCE. JV, Ewo — SLD, 1991. С. 99.

[3] Так, паслядоўніца Юнга, прафесар Нью-Йоркскага універсітэта Беціна Кнэп разглядае прысутнасць архетыпічнага не толькі ў літаратуры, але і ў іншых формах культуры, напрыклад, у танцы. Гл.: Bettina L. Knapp Archetype, Dance and the Writer // New York.: The Bethel Publishing Co., Inc. 1983. 178 p.

[4] *Міронччык Я. І.* Беларускія архетыпы ў мастацкім адлюстраванні Якуба Коласа // Весці БДПУ імя М. Танка. 1996. № 3. С. 37.

[5] *Забияко А. П.* Архетипы культурные // Культурология. XX век: Словарь. СПб., 1997. С. 34.

[6] *Міронччык Я. І.* Анталагічнае значэнне архетыпаў у змесце літаратурнага працэсу // Матэрыялы міжнар. навук.-практыч. канферэнцыі "Прафесійная падрыхтоўка моладзі: праблемы і перспектывы ў святле рэформы агульнаадукацыйнай школы". Мн., 1998. С. 211; *Шавлякова Н.* Путь и вечность Патмосца: Символ в мифопространстве "Скарбаў жыцця" М. Горецкого // Нёман. 1998. № 11/12. С, 248.

[7] *Міронччык Я. І.* Беларускія архетыпы ў мастацкім адлюстраванні Якуба Коласа. С. 211.

[8] *Конан У. М.* Міфалогія, фальклор і літаратура ў кантэксце нацыянальнай культурнай традыцыі // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 4. С. 54.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ